Таня Тамілава

# ФЕІ

Мастачка
Марыся Вярцейка





Таня Тамілава

# ФЕІ

Вершы



Мінск
«Галіяфы»
2019

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-5
Т17

*Малюнкі Марысі Вярцейка*

**Тамілава, Т.**
Т17 Феі : вершы : для дзяцей дашк. і мал. шк. узросту / Таня Тамілава ; маст. Марыся Вярцейка. — Мінск : Галіяфы, 2019. — 16 с. : іл.
ISBN 978-985-7209-18-7.

Ці бываюць беларускія феі? Што яны робяць? І як выглядаюць?
Менавіта з імі, феямі, якія прыйшлі з беларускіх міфаў, і знаёміць кніга юных чытачоў. Кожная фея мае свой занятак, свае непаўторныя рысы і якасці, што надаюць ёй казачную вабнасць. А ўсе разам яны робяць гэты свет прыгожым і дзівосным.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-7209-18-7**

© Тамілава Т.А., 2019
© Вярцейка М.І., ілюстрацыі, 2019
© Афармленне. ПВУП «Галіяфы», 2019



Малечы-дзяўчынцы
Хацелася казкі.
Як разам хадзілі,
Збіраючы краскі,
Вяночкі сплятталі
Ды размаўлялі,
Вобразы феяў
Мы прыдумлялі.
Першая фея —
Насельніца гаю.
Птушак, звяроў
Даглядае другая.
Трэцяя будзе,
Як мама, лагодная,
Рознае зробіць
І неверагоднае.
Чацвёртая будзе
З вадою гуляць,
А пятая — промні
Разам складаць.

Сяброўкі-ГАЁЎКІ ў сад прыляцелі,
На дрэвы, на кветкі яны паглядзелі
І разам за справу так узяліся:
Бліскучыя іскры ў паветра ўзвіліся.

Над кожнай раслінай яны шчыравалі,
Чароўныя фарбы ім аддавалі,
Каб сад той у квецені ўвесь патанаў,
Радаваў вочкі й душу мілаваў.





Ад дробных кузурак да мажных зуброў —
Феі-ВЯЛЕСКІ шануюць сяброў.
Птушкі-пяюшкі ім песні спяваюць:
Працу вялесак яны ўхваляюць.

Зайчыкі скачуць, коткі мурлычуць,
Феяў-вялесак у госці паклічуць,
Мядзведзік варэнне ім прыгатуе,
А вожык суніцамі іх пачастуе.



ЦЯКУТА — майстрыха і творчая пані.
Пашые сукенку за ноч да снядання,
Зварыць абед і прыклеіць шпалеры,
Спляце адмыслова фіранкі на дзверы.

Звяжа нам шапкі да сцюжнай зімы,
Да іх рукавічкі, каб грэліся мы.
У час адпачынку яна вышывае
І добрыя песні дзеткам спявае.


Янка Купала
Якуб Колас
Максім Багдановіч

Фея-РАСІНКА з вадою гуляе:
Сняжынкамі сыпле, дажджом палівае,
Расой заіскрыць і туман прынясе,
Імжыцца ўвосень, блішчыць у расе.

Палётам імклівым дзяцей захапляе,
Дажджынкі-бурштынкі яна раскідае,
Каб дружна ў гародзе ўсё падрастала,
А потым у роце смачна знікала.



Феі-ЗАРАНІЦЫ з сонейкам працуюць:
Промні каляровыя разам дапасуюць.
Зоркі пазбіраюць на начное неба,
Знічкі паскідаюць, як каму патрэбна.

Зробяць нам чароўным месяца святло,
Каб адчулі дзеткі шчырае дабро
І прыснілі ўночы розныя прыгоды,
А можа, патаемнасць роднае прыроды.







З міфам знітаваныя,
Дзецьмі ўпадабаныя,
Феі з’явіліся,
Не памыліліся.

Хай будуць жыць
У нашым сусвеце:
У Беларусі
На роднай планеце.

# Змест

Пачатак
3

Гаёўка
4

Вялеска
6

Цякута
8

Расінка
10

Зараніца
12

Завяршэнне
14

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Тамілава** Таццяна Алегаўна

# Феі

*Для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту*

Адказны за выпуск *Зміцер Вішнёў*
Рэдактар *Віктар Жыбуль*
Вёрстка *Таня Тамілава*
Карэктарка *Ліда Наліўка*

Падпісана да друку 13.03.2019. Фармат 60×90⅛.
Папера крэйдаваная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 1,25. Ул.-выд. арк. 3,22.
Наклад 1000. Замова №1011.

0+

Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Галіяфы».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/48 ад 03.10.2013.
Пр. Партызанскі, 77А, 220107, Мінск.
E-mail: vish@bk.ru
www.halijafy.by

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Полікрафт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/14 ад 21.11.2013.
Вул. Кнорына, 50, 220103, Мінск.

ЕАС



*Ці бываюць беларускія феі?*

*Што яны робяць?*

*І як выглядаюць?*

Менавіта з імі, феямі, якія прыйшлі з беларускіх міфаў, і знаёміць кніга юных чытачоў. Кожная фея мае свой занятак, свае непаўторныя рысы і якасці, што надаюць ёй казачную вабнасць. А ўсе разам яны робяць гэты свет прыгожым і дзівосным.

ISBN 978-985-7209-18-7

9789857209187

ВЫДАВЕЦТВА
ГАЛІЯФЫ